**Алесь Мацулевіч**

# ЛЕЎ І КЛЮЧЫ

pawet.net

**Ліда**
**2015**

## Ад аўтара

Паважаны чытач!

У тваіх руках - кніга паэзіі "Леў і ключы", прысвечаная гораду Лідзе, яго людзям, яго мінуўшчыне і сучаснасці. Ніводная кніга не ахопіць цалкам гісторыю Ліды і яе дзень сённяшні, не ставіў перад сабой такой задачы і я. Вершы, якія склалі першы раздзел, адлюстроўваюць толькі асобныя эпізоды гісторыі горада. Вершы, якія склалі раздзел другі, - толькі асобныя эпізоды яго цяперашняга жыцця. На першы раздзел паўплывала маё захапленне гісторыяй роднага краю, на другі - досвед журналісцкай працы.

Здзейсніўшы з чытачом падарожжа па мінулым, я імкнуўся правесці яго па сённяшняй Лідзе, паказаць некаторыя яе помнікі, яе маляўнічыя месцы, яе людзей, прыроду навакольных мясцін. Я імкнуўся, каб, падарожнічаючы па старонках маёй кнігі, чытач яшчэ раз напоўніўся гонарам за свой горад з багатай гісторыяй, горад, які харашэе год ад года і ўпэўнена глядзіць у будучыню. Як леў, змагаўся горад у розныя часы з захопнікамі. Ключы ад светлай будучыні - у руках яго сённяшніх жыхароў. Шануй свой горад, з годнасцю называй яго мілагучнае імя, не лічы яго "шэрай, адсталай правінцыяй". Да гэтага заклікае мая кніга.

## ЛЕЎ І КЛЮЧЫ

### Замест пралога

*Роднаму гораду*
*да 690-годдзя*

Прывід Гедыміна за плячыма
з барадою, белай, як зіма.
Ці то высечка, ці то дзяўчына
некалі далі табе імя.

Позірк горды, выпрастала плечы,
за якія ганарыцца князь.
Днём - у гуле працы чалавечай,
вечарам - у пацерках-агнях.

***Прыпеў***

Над табою, Ліда, сонца свеціць.
Над табой, прыгожай, птушак спеў.
Наша кветка ў гарадоў суквецці -
ты, чый герб - ключы і мужны леў.

Днём працуеш - выпускаеш фарбы,
піва, малако, камбайны, хлеб…
Ты ад свету не хаваеш скарбаў,
славіш імі свой адвечны герб!

Ты праслаўлена людзьмі тваімі,
ведаюць ключы твае з ільвом,
ведаюць заводы і - між імі -
Лідскі замак у семсот гадоў.

***Прыпеў***

## *Частка 2*

### *Вяртанне Гедыміна з паходу*

Раз вяртаўся Гедымін з паходу
і заснуў над Віліяй-ракой.
Бачыць сон: жалезны воўк на ўзгорку
вые голасна, як сто ваўкоў.

Сон пазней Ліздзейка растлумачыў:
"Воўк жалезны - тут сталіцы быць.
А што моцна вые - не іначай
як аб славе можна гэтак выць".

Князь пазней прывёў палонных мноства,
загадаў - і будаваць пайшлі
замак, як падзяку за прароцтва,
там, дзе хлапчука ў гняздзе знайшлі.

Вырас замак - паратунку якар
ад нашэсця… Бачаць і цяпер:
узвышаецца жрацу падзяка
ў Лідзе, і Лідзейка тут цячэ.

Да нябёс шматпавярхоўкі ўзняты.
Між будынкамі - хада, язда.
У жыццёвым віры арляняты
горада - "арлінага гнязда".

### **Паданне аб пакінутай варце**

Што шэпчаш, вецер з глыбіні вякоў,
што крыламі ўздымаў плашчы з крыжамі?..
На замак рушыць процьма крыжакоў.
У замку - войска, князь ды гараджане.

Спужаўся князь - і з войскам уначы
паспешна ўцёк праз патайную брамку.
Пакінуў перад тым, як уцячы,
ён жменьку вартавых на сценах замка.

зжывалі сваякоў са свету
атрутай і чужой рукой,
Жмудзь, як разменную манету,
давалі ў рукі крыжакоў…

Абодва парушалі клятвы…
Абодва прагнулі крыві…
Палітыя крывёю латы,
брат, перад братам скінь, сарві!

Два ворагі ад дзён яшчэ ўчарашніх
пад Лідай падпісалі мір -
аб заканчэнні войнаў, шашняў
па княстве, навіна, грымі!

Каваль, махай байчэй кувалдай!
Жняя, рэж колас залаты!
Быць перамозе пад Грунвальдам!
Быць росквіту зямель Літвы!

Спазнаецца са светлым часам
Літва, убачыць светлы год!..
Адсюль, над Востраўскім палацам,
пачаўся сонца міру ўсход…

## Мары палоннай княгіні смаленскай
### (*у памяць аб падзеях 1405 года*)

У Лідзе, у замку, княгіня
сядзіць са смаленскай зямлі
ды марыць: "Мне б замак пакінуць,
каб крыламі Бог надзяліў.

Я б з гэтых муроў паляцела,
я б пырхнула ў родны Смаленск,
ля мужа ў палатах бы села
ды склала бы крылы свае.

Прыйшоўся па войсках ліцвінскіх
асноўны тэўтонцаў удар.

Настаў час у ворага цэліць,
свістаць смертаноснай касе.
Князі, і баяры, і чэлядзь -
з тэўтонцамі біліся ўсе.

Ніводнай не знойдзеш паляны
ты ў лесе з людзей і сцягоў.
І білі тэўтонца смаляне,
і гродзенцы білі яго.

Дзяржанне мяча моцна пальцы
сціскалі, меч сёк крыжакоў.
І білі тэўтонца тракайцы,
і віленцы білі яго…

То тут, то там грузна валіўся
крыжак, як падрэзаны грыб.
Ягайла ў асноўным маліўся,
а Вітаўт ад крыку ахрып.

У пекла гарачае бітвы
татар пасылаў Джаладзін…
Крывёй былі травы абліты,
ды трупы - куды ні глядзі.

Ды воіна трупы не страшаць!
Тэўтонец, разгромлены будзь!
Апошнія сілы сабраўшы,
харугвы па ордэне б'юць.

Каб з ордэнам моцным пакончыць,
махалі яшчэ і яшчэ
мячамі… Да заходу сонца
быў ордэн разгромлены ўшчэнт.

Разбіты крыжак! За Літвою
на полі лаўровы вянок!..
І лідскай харугвы крывёю
паліта таксама яно…

Афарбуюць крывёю татарскай
апалчэнцы Літвы Лань-раку.
Вунь за гэта ўздымаецца чаркай
сонца справа, ва ўсходнім баку!

Уздымаецца за перамогу
сонца-чарка з крывавым віном.
Асвятляе мне ў Вільню дарогу,
цела слабае лашчыць яно.

Вунь як неба на ўсходзе зардзела!
Ды крылом засланяючы дзень,
над разбітым паралічам целам
нехта лётае, кідае цень.

Смерць-крумкач нада мною кружыцца.
Толькі веру: дзён колькі міне -
навіна аб разгроме чужынца
перад смерцю суцешыць мяне.

І пакажацца ў яркай прасторы
не крумкач, а пасланец-анёл…"
Думаў так Аляксандр, цяжка хворы,
у калысцы паміж двух канёў…

## Леў і ключы

***(у памяць аб падзеях 1590 года)***

Ганарыся, нос уверх
задзяры, лідзянін:
атрымала Ліда герб -
шчыт са львом, з ключамі!

Поле ў ворагаў крыві.
Леў на ім адважны.
Хто з мячом прыйшоў - раві,
на кіпцюр насаджаны!

Робіць з Дворышча змей папялішча,
робіць Ваверцы хвост агнявы.

Рабаўнік па павеце пашарыў,
перабіў, папаліў, абабраў.
Я ад войска ўцякаў, ад пажараў,
і цяпер я бадзяга-жабрак.

І скрозь зубы свае, як умею,
ад душы, дзе бурліць гнеў агнём,
наўздагон агнядышнаму змею
пасылаю гарачы праклён!

## Подых Паўночнай вайны

Гандляры дрыжаць у крамах:
швед у горад уступіў,
дзвюх "галоў" пазбавіў замак.
Добра, каб сваю згубіў!

* * *

Нібы шведы, вараннё
ў страсе разляцелася:
конь цара Пятра пранёс
у Маскву праз Беліцу.

* * *

Шведы, хоць не цыганы,
а каня пазбавяць.
Не пакажаш хлеб - яны
самі ўсё дастануць.

* * *

Галаву панурыў дзед,
плача, небарака:
белага каня ўзяў швед,
чорнага - казакі.

## Фарны касцёл
### *(у памяць аб падзеях 1770 года)*

Ідзе натоўп братоў, сясцёр,
душа Ўсявышняму адкрыта.
У Лідзе ўзнесены касцёл
Узвіжання Святога Крыжа.

Належаў Глаўбіцу праект
познебарочнага тварэння,
біскуп Віленскі манет
ахвяраваў шмат на ўзвядзенне,

каб творцам богаўгодных спраў
у сродках не было нястачы…
Ды заснавальніку свой храм
не суджана было пабачыць.

Шчаслівы ў пабудовы лёс:
ні разу храм не зачыніўся,
хаця пабачыў войн і слёз,
абрыс амаль што не змяніўся.

Будынак гэты час не сцёр.
І сёння верай сэрцы дышаць,
і сёння ходзім мы ў касцёл
Узвіжання Святога Крыжа.

## Запіскі паручніка Розена

*У 1821-1822 гг. пад Лідай, у Беліцы, жыў*
*паручнік Фінляндскага гвардзейскага палка*
*Розен, будучы дзекабрыст.*

Эх, прастор мяцеліцы!
Нам - кватэрка цесная.
На пастоі ў Беліцы
наша часць гвардзейская.

## Запольскі абшарнік

***Памяці Ігната Дамейкі прысвячаецца***

Кіруе маёнткам Заполле
абшарнік Дамейка Ігнат.
Як пану, Дамейку ў запале
тут першую скрыпку іграць.

Аддаўся Ігнат гаспадарцы,
часопісам, кнігам па ёй.
Вучоны - чаму б не аддацца,
здзяйсняючы думак палёт?

Разводзіць пародзістых коней
і дбае аб долі сялян.
Іх дзеці, што вучацца ў школе,
Ігнату душу весяляць.

Паўзе ў адзіноце час-змейка.
Жыве ў адзіноце Ігнат.
Жыве ў адзіноце Дамейка.
За ім - паліцэйскі нагляд.

* * *

Калі над тваёю верандай
праносяць каметы хвасты,
ці сняцца далёкія Анды,
што будзеш даследаваць ты?

Як зорачкі россыпам ягад
пачнуць над верандай мігцець,
ці сняцца далёкі Сант'яга
і тамашні ўніверсітэт?

Ці сняцца чылійскія шахты
і тамашнія руднікі?
Ці бачыш, Дамейка, у снах ты,
як горбяцца там гарнякі?

Ці сніш акіянскую пену
і над акіянам вятры?

І мастака ў баі параняць,
што з Нарбутам быў заадно…
Перанясе мастак-паўстанец
смерць Нарбута на палатно…

Ды з памяці не забірае
ні смерць, ні час, які плыве.
На палатне ён памірае,
а ў нашай памяці - жыве.

## Панна Даравінская ў Шаўрах

*У аснову адной з першых публікацый беларускага і польскага этнографа XIX стагоддзя Амеліі Даравінскай (Біруты) пакладзены абрад дажынак у вёсцы Шаўры Лідскага павета.*

Занатоўвае дажынкі
Даравінская ў Шаўрах.
Жней, касцоў вядзе сцяжынка
з ёй да панскага двара.

Бачыць: жнейка апранае
залаты вянок, пяе.
Песня жніўная кранае,
зачароўвае яе.

Занатоўваць песню стане,
што пяецца дапазна:
"Мы дажалі жыта, пане.
Нас па голасе пазнай…"

Бачыць: выйшаў пан на ганак,
шмат пачуўшы галасоў.
Вось вянком віншуюць пана.
Грошы наўзамен, хлеб-соль.

Танцы бачыць, пачастункі.
Бачыць шчодрыя сталы.

Іх канструяваў Сікорскі.
Наймагутнейшыя ў свеце!
Ні ў капусту, ні ў махорку,
немцы, іх не разнясеце!

Вось дык галава Сікорскі!
Ганарыцеся! Хваліце!"
Супакоілася вёска:
"Ілья Мурамец" у Лідзе…

## Нашыя дні

Сёння ні адзін вясковец
самалётаў не баіцца -
і касца не непакоіць
гул іх над зямлёю лідскай.

Наш народ прывык да міру,
да машын, да самалётаў.
Век амаль што, як у Ліду
"Мурамец" расійскі лётаў.

Даўняя падзея тая.
Не ваюем мы з германцам.
У гісторыі застаўся
гул ваеннага гіганта.

## Госці паэта
### *Да 100-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая*

*Аўтару верша ў 2003 годзе давялося сустрэцца з Марыяй Маркаўнай Расухінай і Леанардай Браніславаўнай Пуйдак, якія былі частымі гасцямі паэта, супрацоўніка газеты "Уперад" Валянціна Таўлая, калі той жыў у Лідзе (1939-1941 гг.).*

"Уперад!" - часу трубы клічуць.
Ідзе жыццё хадою новай.

Хто застаўся - мокры нос павесіў,
калаціўся ўвесь, усхліпваў, роў.

Дзецям ноччу жудаснай не спіцца -
уяўляе беднае дзіцё,
як павук са свастыкай на спінцы
з сініх вен высмоктвае жыццё,

як ахвярам тыкаюць у грудзі,
як вядуць дзяцей да санмашын…
З сініх вен-рачулак Беларусі,
крыважэрны, піў жыццё фашызм…

## Інжынер Іяхім

Рэжым фашысцкі пакрываў
карычневай смугою Ліду.
Піўным заводам кіраваў
Іяхім, інжынер з Берліна.

Яўрэі многія пры ім
знайшлі работу на заводзе.
Ды ў ботах колеру крыві
тэрор-фашыст па Лідзе ходзіць.

Ля завадскіх варот тэрор
і ботам грукае ў вароты.
Ды не пусціў Іяхім морд
і гутарка была кароткай.

З завода кінулі на фронт
яго, заступніка яўрэяў.
У Ханвега* ва ўхмылцы рот:
"На фронце, можа, азвярэеш.

Ваюй, звярэй"… Праз тры гады,
у пераможным сорак пятым,
арыштаваны як фашыст
амерыканцамі Іяхім.

# РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

## Сучаснасць

### У свеце рыцараў

Стаў нядаўна я, паверце,
членам рыцарскага клуба.

Стаў - і апынуўся ў свеце
рыцараў ды дам-галубак.

Тут даспехі, зброю носім мы.
Тут васальныя адносіны.

Для турніру, для пацехі
зброю робім і даспехі.

Праліваю пот ракой:
меч узважваю рукой.

Рыцарскі ідзе турнір.
Мы на рыцарскай гульні.

Па наплечніку б'е меч.
Дакрануцца бы да плеч!

Крыжакоў сяку сякірай.
Гляньце, меткі ўдар які мой!

Дзідаю трапляю ў цэль -
у плашча тэўтонца бель.

Звон мячоў, тарана гром -
крэпасць штурмам мы бяром.

Сходзімся грудзьмі на грудзі.
Схопліваемся ў бугурце.

Тут, у дзейнасці кіпучай,
рыцары не толькі б'юцца.

Латы моцныя і ў ззянні -
мятымі не зробяцца!..
Аказаўся, мой лідзянін,
ты мацней за гродзенца!

Між сабою па-сяброўску
абняліся "ворагі":
"Між сабой сябры - не воўкі -
у любым мы горадзе.

Брацця̆ў - рыцараў плашчамі
ўся зямля засцелена.
Памахалі мы мячамі,
а цяпер - за келіхі!"

**Сярэднявечны танец**

"Што за людзі скачуць?" - маму
дзеці здзіўлена пытаюць.
"Праз шэсцьсот гадоў у замку
зноў сярэднявечны танец.

Дамы скачуць, кавалеры
дружна, весела, нястомна.
Здольны, можаце паверыць,
так, пакуль не стане цёмна.

Воплескі ды: "Ойра, ойра!" -
замак ажывілі ціхі -
і нясе, здаецца, горад
у сярэднявечча віхар".

Сын з дачушкай кажуць маме:
"Хоць узрост наш і маленькі,
хочам танцаваць як дамы,
танцаваць як кавалеры".

"Станеш рыцарам, мой хлопчык.
Станеш дамаю, дачушка.
Рэканструктары-гурткоўцы
гэтым танцам вас навучаць.

Глядзіць на замак і на паплавок
лідзянін, што сюды прыйшоў рыбачыць, -
і Гедыміна прывід па той бок
ля возера і ў возеры ён бачыць.

Князь Гедымін вітае рыбака,
гаворыць з-за азерца ды з азерца:
"Злавіць табе жадаю шчупака
я ў возеры, што Замкавым завецца!"

## У доміку Таўлая

Нібы ля дзеда ўнук-паэт,
ля замка - дом-музей Таўлая.
Яго пакой, яго партрэт
і лямпа на стале старая.

Здаецца, у пакоі тым
яго і сёння чутны крокі.
Пачуй, як дыхаюць лісты,
дыханне дакументаў копій.

Пераступі цяпер парог
пад гэтым позіркам нязгасным -
зрабі з яго пакоя крок
у свет паэзіі сучаснай.

А на другім паверсе ты
майстроў паэзіі пабачыш.
"Суквецце" тут - заходзь сюды!
Глянь, колькі сэрцаў тут гарачых!

Смялей! Не цісніся ў кутку!
А мо, і ты таленавіты?!
Табе падораць кніжку тут
з аўтографам паэта Ліды!

Адчуй паэзіі цяпло,
снег лістапада, зелень мая:
нязгаснае яе святло
гарыць у доміку Таўлая.

Ляцяць, канькамі рэжуць лёд
дарослыя і дзеці.
Не спыняць радасны палёт
мароз і злосны вецер.

### "Лідская лыжня"

Ад бегу ўзімку цеплыня
і шчок гарэнне -
сабрала "Лідская лыжня"
тры пакаленні.

На палкі лыжныя налёг
(старання колькі!),
спяшаецца, нібы на ўрок,
на фініш школьнік.

Аддаўся бегу з галавой,
бяжыць, увішны,
на фініш, нібы на завод,
рабочы-лыжнік.

"Лыжня - яна і для мяне!
Я лыжнік палкі!" -
замест адной пенсіянер
узяў дзве палкі.

Дарослых спорт запаланіў,
старых, маленькіх -
праходзяць шпарка па лыжні
тры пакаленні.

### Дыханне вясны

Да Сонца ў планет карагодзе
наш край зямны шар павярнуў -
у парку зіму мы праводзім
і дружна гукаем вясну.

"Вам дзякуй, - скажуць дзеці, -
што ў парк нас запрашалі!"

Вясной спявайце яркай,
танцуйце ды іграйце!
Працоўным скажам дзякуй
у Дзень вясны і працы!

## Гарадок дзіцячых мар

Здарова, лета! Парк, здароў!
Здарова, каруселі!
Дзіцячых госці гарадоў
прыйшлі, на мару селі.

Вітай "Арбіту", "касманаўт"!
Вітай "Чыгунку", "дачнік"!
Тут весялосць такая нам!
Нас весяляць катанні!

Катаннем вабіць парк дзяцей.
Сеў на каня Рыгорка.
Хто - на ланцужнай паляцеў.
Хто - на "Вясёлых горках".

Ярчэй за новенькі цягнік
пафарбаваны конік!
Алень з прастораў ледзяных
цягнік яшчэ нагоніць!

Тут і тарзанка, і батут,
і электрамабілі!
Дзіцячая краіна тут!
Яе для нас зрабілі!

У гарадок дзіцячых мар
аўтацягнік закінуў.
Для нас зрабілі дзядзі парк -
дзіцячую краіну!

Памочнікі старанныя,
памочнікі карысныя,
напагатове станцыі
радыёлакацыйныя.

У высі чыстай, быццам лёд,
у высі аблакастай
аблокі, птушку, самалёт
улоўлівай, лакатар!

Ці снедаеце, ці абед,
ці гарызонт зардзее -
пракантралюецца аб'ект,
што рухаецца ў небе.

Там, дзе аблокі камячыць,
бы прасціну, стаў вецер,
мы парушальніка мяжы
паветранай прыкмецім.

І раніцаю раненька,
бы спрытныя касаткі,
пілоты парушальніка
прымусяць да пасадкі.

Наш вузел - вушы СПА.
Наш вузел - яе вочы.
У небе можам распазнаць
аб'ект і ўдзень, і ўночы.

**Тыдзень лесу**

Дзе птушка ўдзень не шчабятала
ні разу песню,
засадзім тысячы гектараў
за Тыдзень лесу.

Вясна ўсміхнулася, здаецца,
і падабрэла.
Ідзём з кашолкамі да месца,
дзе будуць дрэвы.

Праменьчыкі - стрункі гітары -
пасадкі аблашчаць вясной…

Лясы зашумяць праз паўвеку,
надорацьшмат ягад, грыбоў
і свежым абдорацьпаветрам,
як дорацьматулі любоў…

Час прыйдзе - старая яліна
пачуе піл гукі, сякер.
Час прыйдзе - абдорацьдраўнінай
лясы, што пасадзім цяпер…

Лясгасам садзіць дапаможам
шмат сосен, бяроз ды ялін!
Багацце зялёнае множым -
лясы беларускай зямлі!

## На ваўка

Воўк да фермы не палезе:
на ваўка, ружжо ў ружжо,
крок у крок, ідзе па лесе
паляўнічых ланцужок.

Воўк цялушкай не наесца:
на ваўка наш патранташ.
Ланцужок прыйшоў на месца.
Пераклічка. Інструктаж.

Тэлефонаў перазвоны.
"Па "трубе" ваўкам не выць!
Адключыце тэлефоны!
Гутарцы з ваўком не быць!

Затушыце цыгарэты!
Станьце ўсе па нумарах!
Стрэльну - значыць выстрал гэты:
сустракаць ваўка пара!"

Загінуў ён у схватцы
са сталым вепруком.

Загінуў ён, нястомны,
на радасць секачу -
і паляўнічы помнік
паставіў Вайгачу.

**Бабровыя слёзы**

Глядзіць двума ствaламі стрэльба
ў бабра спалоханыя вочы -
і просьба ў тых вачах: "Не трэба!",
і звера морду… нешта мочыць.

Сядзіць ён перад паляўнічым
і вастраносую трэ морду.
Блішчаць расінкі слёзак-знічак.
"Узяў, зубаты, плакаць моду".

Упершыню наш паляўнічы
бабровыя пабачыў слёзы.
"Бабёр расплакаўся! Глядзі ты!
Раве і не мяняе позы!

Не плач. Цябе не буду крыўдзіць.
Ідзі, зубаты, да бабрыхі.
Ідзі ў нару. Ідзі ва ўкрыцце.
Сядзі з бабрыхаю ва ўкрыцці".

Глядзіць ён гузікамі вочак
на чалавека і сабаку -
і чалавек страляць не хоча,
убачыўшы, як ён заплакаў.

І кажа чалавек: "Не трэба".
Сляза бабра яго змякчыла.
І апускае вочы стрэльба
перад бабровымі вачыма.

Побач плаваюць з катамаранам.
Птушак не палохае сабака.
Рыбакі на бераг прыйдуць рана -
да кампаніі плывуць рыбацкай.

Хлеб даюць - на сушу могуць выйсці.
З птушкамі фатаграфуюць пары.
Лебядзіны свет, бацькі, адкрыйце
дзіцяняці, што іх бачыць марыць.

Дзень пагодны - дома не сядзіце.
Лебедзі чакаюць вашай ласкі.
Дзіцянё на возера вядзіце -
хай яно пабачыць птушак з казкі.

Не адну праводзяць змену
ў лагеры спартыўным дзеці.
Ціснуць вёсламі спартсмены.
Ім дапамагае вецер.

Разам з летнім, разам з вольным
ветрам хочацца мне сёння
веслярам спартыўнай школы
пажадаць канікул плённых!

## Катэр-вецер

*Лідскім спартсменам-караблемадэлістам прысвячаецца*

Мы на возера глядзелі -
не расчараваныя:
кружаць катэраў мадэлі
радыёкіраваныя.

* * *

Караблі імчаць як вецер:
быць як вецер - іх дэвіз.
І дарослыя, і дзеці
любяць караблемадэлізм.

* * *

Змайстраваў нам тата катэр.
Мы - пускаем па вадзе.
Пераможца наша з татам
хуткаходная мадэль!

* * *

Нашы караблемадэлісты
прадэманстравалі клас.
Катэр лідскі - самы хуткі!
Месца першае - у нас!

## Вадалаз

Над берагам песня лятала:
"Вада-а-а не пало-о-охае на-а-ас!.."
З паддатага хлопца з гітарай
не зводзіць вачэй вадалаз.

Ён бачыць: у смерці абдымкі
нырае паддаты хлапец,
які на гітары пабрынкаў,
які спрабаваў, п'яны, пець.

Нырэц не спяе, не іграе -
яго паглынае вада!
І вось вадалаз наш нырае
туды, дзе наспела бяда.

Без маскі, без ласт вырывае
з лап смерці ён гора-нырца.
Ваду захад сонца крывавіць -
прыблізіўся дзень да канца.

Ды ў хлопца жыцці маладога
апошнім не стане той дзень!
Хвілінка масажу прамога -
і хлопец з гітарай сядзеў!

Прыдумае пра вадалаза
ён песню - і будзе спяваць!
А перад купаннем ні разу
не стане хлапец выпіваць!

## Прагулка на выратавальным катэры

Адчаліўшы ва ўсёй красе,
пакінуў ззаду пляж стракаты,
па гладзі возера нясе
мяне выратавальны катэр.

А возера - глядзіць яно
на п'яных позіркам халодным.

"За тых, хто ў марах", па тры чаркі асушаць
і флоцкія ўспомняць дзянькі
матросы душою і мічманы ў душах,
жывуць успаміны ў якіх.

Успомняць аб днях рамантычных і цяжкіх.
Трывалы марскі іх саюз!
На беразе возера людзі ў цяльняшках
прыгадваюць службу сваю.

***Зімовыя эцюды***

**Новы год у палонцы**

Горда крочаць гусакамі
да вады. Настрой - мажор!
У палонцы сустракае
Новы год сям'я маржоў.

Смела крочаць чарадою
да вады. Да пят "зарос"
белай ватнай барадою
тата-морж, як Дзед Мароз.

Дзве сасновыя галінкі -
"ёлку" - мама-морж нясе.
Два ліхтарыкі маленькіх
у руках маржоў-дзяцей.

Развітаўся год мінулы -
і за ледзяную гладзь.
"Новы год праз паўмінуты -
значыць, нам пара ныраць!"

Мары светлыя затояць
дзеці, маці, "Дзед Мароз",
п'юць шампанскае за тое,
каб увесь год - без хвароб.

## Вадохрышчанская купель
## Адчуванні нырца

Да цуда-возера імкнуся:
святая ў ім вада цяпер.
Чаргі чакаю акунуцца
ў вадохрышчанскую купель.

На беразе народу мноства.
Бліжэй, бліжэй мая чарга.
"Не прабярэ мароз да костак!
Ныраій - і вокам не маргай!"

Ныраю я ў ваду святую.
Не холадна і лёгка мне!
Хваробу не ўпушчу ў ваду я -
- хваробу праганю ў каўнер!

Не месца ў возеры хваробам,
калі ў душы пяюць званы!
З усмешкаю і са здароўем
я падымаюся з вады.

З усмешкаю я апрануўся.
І доўга звон царкоўны пеў…
Мне радасна, што акунуўся
ў вадохрышчанскую купель!

## Зімовая рыбалка

Мароз куе, мароз злуе
і панцыр возеру шле новы.
Як толькі лёд яго скуе -
на лёд выходзяць рыбаловы.

Свідруе дзіркі-лункі бур,
і пачынаецца рыбалка.
Сядзі, ад сонца вочы жмур,
чакай, чакай удачы ўпарта.

На возеры ў падлёднай лоўлі
спаборнічаюць прадпрыемствы.
Жадаю кожнаму напоўніць
вядро на прызавое месца!

**Паўтара кіло (1500 г) - намёк на камбайн
"Ліда-1600".*

## Рыбачка з Набярэжнай

Над возерам духоў плыў водар,
як кветак водар над лужком.
Яна рыбачыць трошкі воддаль
ад рыбаловаў-мужыкоў.

Яе тут за сваю прымаюць.
Яе тут ведаюць даўно.
Рыбачка вудачку трымае
і напявае заадно.

Бярэцца мужыкам на зайздрасць
карась, шчупак, акунь ды ёрш.
Улоў яе багаты зараз -
насы мужчынам ён уцёр!

У ззянні радасці бязмежнай
твар адлюстроўвае вада.
Яна жыве па Набярэжнай -
да возера рукой падаць.

Зімой ёй дома не сядзіцца -
рыбачыць ходзіць кожны дзень.
Няхай скавана льдом вадзіца -
ды рыба водзіцца ў вадзе!

Сюды не трэба ехаць вёрсты!
Ізноў вядзерца пад рукой.
Ізноў над возерам замёрзлым
плыве вясенні пах духоў.

Лес дрымучы абуджае
раніцою стук сякер.
Птушак гэты стук пужае.
Людзі ходзяць тут цяпер.

Правадыр прыгладзіў жменяй
барады ільнянай пук.
Ліды першыя імгненні
абвясціў сякерны стук.

### *Частка 2*

### **Нёман**

Мора трох вякоў схавала
кроплі першых тых гадоў.
У глушы жыцця кавалак.
Рэкі поўныя вадой.

І кругом маленькай Ліды
рэчкі водзяць карагод -
спеў з гаркотаю каліны
л'ецца, л'ецца з года ў год.

"Як згубілася, дзяўчынка,
ты сярод балот, лясоў!
Як убогая пясчынка,
што пакінула пясок.

Як мізэрная сняжынка,
што пакінуў снегапад.
Не вядзе сюды сцяжынка -
некаму сюды ступаць.

За лясамі, як за сценкай.
Сценкаю кругом дрыгва".
Пелі Каменка з Лідзейкай,
Жыжма, Крупка ды Дзітва.

У сцяне лясоў ды багны
хто акенца прасячэ?

Паміж Каменкай з Лідзейкай
тыкнуў Гедыміна перст.
Сеў. У галаве ідэйка
хутка пачынае спець.

### *Частка 4*

### **Замак**

Вецер-конь з далін балотных
нёс людскія галасы -
русічаў вялі палонных
праз балоты, праз лясы.

Птах-ганец вярхом на ветры
Лідзе навіну нясе:
"Нёман недарэмна верыць!
Глянь! Ідуць ва ўсёй красе!

Глянь, якую цягнуць цэглу!
Глянь, якія камяні!
Іх паток нахлынуў цэлы!
Сценку, Ліда, памяні!

Цэглаю прабілі сценку!
Камянямі - па дрыгве!
Назірай, дзяўчынка, сцэнку!
Будаванню ў нас грымець!"

Назірае за работай
Ліда, прыадкрыўшы рот.
"Праз лясы і праз балоты
вы прыйшлі з якіх шырот?"

"Мы палонныя з Валыні.
Захапіў нас Гедымін.
Ты далонямі малымі
замак ад гасцей прымі.

Нібы баявая мама,
ад нашэсця і ад бед

## *Частка 6*

### Горад

Не да жартаў, каб смяяцца.
Не да песеняк-журбот.
Вартавым патрэбна мяса.
Ім патрэбны хлеб і мёд.

Ваяру патрэбны дровы,
каб узімку не дубець.
Луг патрэбны ды каровы,
пастушок, што ўзяў дубец,

і каваль, што возьме молат,
і жняя, што возьме серп…
Вартавым патрэбны горад -
гораду тут быць цяпер!

Так жадаюць вартавыя!
Так жадае Гедымін!
Ты адзенні гарадскія,
Ліда, ад людзей прымі!

Ліда мерае абноўкі.
Ліда ў Каменку глядзіць.
Паша, і на ёй - кароўкі,
і над лугам птах ляціць.

"Ліда - гор-р-рад! Ліда - гор-р-рад! -
каркае вясёлы птах. -
І даведаюцца скора
ўсе аб ёй - і скажуць "Ах!"

Кавалі на адпачынку
песню звонкую "куюць".
Пра карміцельку-дзяўчынку
ў замку воіны пяюць.

## ВАЙДЫЛА
***Гістарычная паэма***

### *Пралог*

Варта мне пра тое ўспомніць,
варта мне з таго пачаць,
што пад Лідай, у Дуброўні,
быў калісь яго палац.

### *Частка 1*

### Узлёт

Пекара свайго - Вайдылу -
князь Альгерд упадабаў.
Так да пазалоты з пылу
распачаўся ўзлёт раба.

Князю верны, верны гербу,
наш герой мінут за пяць
засцілаў пасцель Альгерду,
як Альгерд збіраўся спаць.

Князю верны, верны гербу,
наш герой бяжыць, сапіць,
падае ваду Альгерду,
як Альгерд жадае піць.

Ход ад чэлядзі да верху
рые з хуткасцю крата.
Быў падчашы - стаў Альгерда
асабісты сакратар!

Весткі вухкаюць грымамі,
вухкае ў дупле сава:
воласць Лідскую трымае
той, хто кубкі падаваў!

Вестка па палях хадзіла,
вестка па рацэ плыве:

З-за стала халоп падняўся,
зубы скаліць, бы ў каня:
ён ужо дарадчык князя,
і ягоны швагер - князь!

## *Частка 3*

### Гнеў

Абураецца баярства
ва ўсім княстве: "Вось дык шлюб!
Што Ягайла робіць з княства?!
Хіба бразнуўся аб слуп?!"

Князь Кейстут, Ягайлаў дзядзька,
абурыўся, звар'яцеў:
"Нейкі пекар з голай пяткай -
першы ў княстве багацей?!"

Папракае, гневу поўны:
"Ты, Альгердава ўдава!
Як не сорамна князёўну
хлебапеку аддаваць!

Ты, Ягайла, сын Альгердаў!
Гедымін цябе б забіў,
каб жывы быў і каб ведаў,
кім Вайдылу ты зрабіў!

Ты, пасцельнічага жонка!
Поплеч з пекарам сядзець?!
Я "пачаставаў" бы звонкай
аплявухаю цябе!

Ну а ты, Вайдыла-пекар!
Думаеш, слуга, раз жыць
стаў пад князевай апекай -
можаш ледзь не князем быць?!"

Князь Кейстут размову крута
вёў з дарадцам і слугой!

### *Частка 5*

## **Прысяга**

Думаў, думаў - і рашыўся
дзядзька на пераварот.
Грымнуў гром, калі лажыўся
снег ля гарадскіх варот.

З першым снегам нечакана
войска ў Вільню ўвёў Кейстут.
"Княжанне тваё, Ягайла,
скончылася! Я ўжо тут!

Пекар, ведай! Ведай, мельнік!
Я пляменніка ў палон!
Княжанне тваё, пляменнік,
скончылася! З трона - вон!

І патрабаваць я буду,
каб гара прапала з плеч:
прысягай, шчаня, Кейстуту,
што не ўздымеш болей меч,

што не выйдзеш ты з-пад волі
дзядзькі роднага свайго!"
І ў пляменніка паволі
згаснуў у вачах агонь.

Прысягаў Ягайла дзядзьку,
нахіліўшы галаву.
І адкладваў ён, як цацку,
меч убок ды булаву.

Галаву падняў памалу.
Верным позіркам глядзеў.
І адправілі Ягайлу
ў Віцебск - на бацькоўскі ўдзел.

### *Частка 7*

### **Ягайла**

Што вятры гавораць сцягу?
Пра Ягайлу шэпт вятроў:
як парушыў ён прысягу,
як адваяваў ён трон,

як адпомсціў за Вайдылу
дзядзьку роднаму свайму…
Месца ў летапісе пыльным
факты гэтыя займуць.

Ды пра тую помсту трэба
нам занатаваць і тут:
залатым шнурком у Крэве
быў задушаны Кейстут.

У даліне Свінтарога
спалены вялікі князь.
Над парэшткамі старога
дым кастра паволі згас.

Вецер прах яго развеяў
На тры тысячы сцяжын.
Вёрткім, хутканогім зверам,
вестка, праз Літву бяжы:

"Я, вялікі князь Ягайла,
толькі пачынаю ўздым.
Мне вышыні адкрывае
па старым Кейстуце дым.

Адчуваю на паўвеку
сіл да ўлады я ў сабе!
Пра Ягайлу на паўсвету
вухкаць грому і саве!"

На вяршыні ханскай славы
Тахтамыш сядзеў і ззяў.

Сонцам з юрты ззяў прасторнай,
з клумбай жонак маладой,
хан Арды нябесна-зорнай -
Белай, Сіняй, Залатой.

### *Частка 2*

### Выгнаны са стэпаў родных

Круглатварым сонцам-ханам
так і ззяў бы ён гады…
Ды пагрызся з Тамерланам
хан Вялікае Арды.

"На каго, шчанюк, палез ты?!"
Тамерлан вам не Мамай -
хану ля варот Жалезных
мігам зубы абламаў!

Тахтамыша ўжо малая
рацць: парэзалі! Як быць?!
Гарады Арды палаюць -
і пад ім зямля гарыць!

Ён за горад абгарэлы
скакуна свайго пагнаў.
Наўздагон ляцелі стрэлы -
вось у шапцы ўжо адна!

Тахтамыш у ханскай шапцы
прадзіраўленай скакаў.
Шрам на скуле. Мае шанцы
ўспухнуць правая шчака.

Ад расправы, ад пагоні,
быццам спрытная блыха,
задаваў са Стэпу сёння
драпака ўчарашні хан.

Ціхімі начамі ў Лідзе
Тахтамышу сніцца Стэп.

### *Частка 4*

### "Тахтамыша я не выдам"

А Кутлую так не спіцца:
быццам прывіда дзіцё,
Тахтамыша хан баіцца,
хоць далёка той уцёк!

Ад Арды па снезе хрусткім
госць у Вільню прыскакаў.
Вітаўта пасол кутлуйскі
просіць выдаць бегляка:

"Сонца ў агнявой кароне
з цемрай дасягне мяжы.
Сёння львом сядзіш на троне -
заўтра зайцам пабяжыш.

Час адны пакіне рэбры -
і працягнецца рука.
Сёння плюхаешся ў срэбры -
заўтра з торбай жабрака.

Пройдзе час - і войскі ў браму
ўдараць, як паток вады.
Сёння двор кішыць сябрамі -
заўтра ворагі адны.

Сёння радасць - заўтра гора
спусціць голавы сцягоў.
Тахтамыш - наш злосны вораг!
Вітаўт, выдай нам яго!"

"Тахтамыша я не выдам", -
цвёрда Вітаўт адказаў.
Госць на князя глянуў выдрай,
выйшаў, паскакаў назад.

## *Частка 6*

### Шапку ў бітве ён згубіў

Князь з вялікім міжпляменным
войскам зноў прыйшоў у Стэп.
"Ядрамі мукі намелем
мы з татаравых касцей!

Пагавораць нашы пушкі
і пішчалі з татарвой!
Перамога наша птушкай
залунае над Ардой!"

Ды на Ворскле князь вялікі
паражэнне пацярпеў -
рвуцца воінаў шматлікіх
жыцці ў смерці на сярпе.

Шчодрая, як з бочкі віннай,
кроў муціць ракі блакіт:
целы рускіх, і ліцвінаў,
і палякаў ля ракі.

З поля бітвы, з поля смерці
першы Тахтамыш пабег -
прэтэндэнт на ўлады лейцы,
злосны беглы чалавек.

Тахтамыш бяжыць без шапкі:
шапку ў бітве ён згубіў.
Хутка, хутка, каб на лапкі
хан Кутлуй не наступіў!

Каб на беразе бяздоннай
Ворсклы не зляжыць касцей,
Вітаўт з братам Жыгімонтам
пакідалі злосны Стэп.

## ЧЫРВОНАЯ РУЖА

***Гістарычная драма ў пяці дзеях***

Дзейнічаюць:
1. Кароль Аляксандр.
2. Жонка караля Алена.
3. Біскуп.
4. Канцлер.
5. Медык.
6. Кухар.
7. Ганец у цёмнай вопратцы.
8. Ганец у светлай вопратцы.
9. Воін з кайстрай.
10. Воін з дзвюмя акрываўленымі стрэламі.
11. 1-ы апалчэнец.
12. 2-і апалчэнец.
13. Апалчэнцы.

### Дзея першая

*Лета 1506 года. Вільня. Каралеўскі пакой. Кароль Аляксандр, цяжка хворы, ляжыць на ложку. Каля яго сядзіць жонка Алена. Уваходзіць медык.*

**Медык:**
Лекі каралю давалі?

*Алена сцвярджальна ківае галавой.*

**Медык** *(паглядзеўшы на Аляксандра, затым на сцены пакоя):*
Сцены бледныя, як сам!

*(Аляксандру, таксама сеўшы каля яго)*

Аб душы выратаванні
патурбуйся, Аляксандр.
Спавядайся, прычашчайся.

**Алена:**
Вельмі кепска каралю.

Уварвалася ў дзяржаву
Перакопская Арда.
З ёй Біці-Гірэй, сцвярджаюць,
і яшчэ - Бурнаш-Салтан.
Слуцк, Мазыр разрабавалі.
Каля Клецка лагер іх.

**Медык** *(Аляксандру)*:
Аб душы выратаванні
патурбуйся…

**Аляксандр** (*медыку, нецярпліва)*:
Ты бы сціх.
Дай ганца даслухаць, медык.

**Медык:**
Я маўклівы, як сцяна.

**Ганец** *(працягвае)*:
Шпарка, з хуткасцю каметы,
па Літве ляціць бяда.
Каля Нёмана татары -
на ягоных берагах.
Уступіць у Вільню марыць
хан іх, конская нага.

**Алена** *(злосна)*:
Не патрэбна запрашэнне
"госцю" з рабаўніцкіх орд.

**Аляксандр *(прыпадымае галаву, слабым, але цвёрдым і рашучым голасам):***
Паспалітае рушэнне
аб'яўлю. У Лідзе - збор.

***Заслона.***

**Дзея другая**

*Ліда. Месца збору рушэння. На заднім плане - некалькі шарэнг з апалчэнцаў. Усе чакаюць прыезду Аляксандра. На пярэднім плане - два*

*падтрымлівае, неадступна ідучы побач, Алена. Кожны крок даецца Аляксандру з цяжкасцю, ён, здаецца, вось-вось упадзе. Але кароль з апошніх сіл стараецца выглядаць бадзёрым і зарадзіць сваёй бадзёрасцю ўсё апалчэнне.*

**Аляксандр** (*гучна, як толькі можа пры сваім стане):*
Вас вітаю, паны шляхта!

*Апалчэнцы адзываюцца гучным і бадзёрым трохкратным: "Віват".*

**Алена** *(Аляксандру, занепакоена):*
Асцярожна, не ўпадзі.

**Аляксандр:**
Абавязак у вас слаўны -
супраць ворагаў хадзіць!
Ваш пачэсны абавязак -
ворагаў прагнаць з Літвы!
Вам спаможанне святое -
веру: пераможцы вы!
Перамога - за Літвою!
Быць разбітым крымчаку!

*Раптам галава Аляксандра бязвольна апускаецца, ён ледзь не падае.*

**Алена** (*устрывожана, усё гучней і гучней):*
Панікае галавою!
Паглядзіце на шчаку!
Шчокі ў караля бляднеюць!
Войска ён не павядзе!
Хай татары вар'яцеюць!
*(Нахіляецца да напалову ўпаўшага Аляксандра, Аляксандру, ласкава і сумна):*
Твой апошні скора дзень.

**Аляксандр** *(з апошніх сіл, ціха, але цвёрда):*

**Канцлер:**
Нехта з крымчакоў пашпарыць.

**Біскуп:**
Нехта ляжа ля ракі.

*Уваходзяць два стомленыя воіны. У аднаго кайстра, у другога - дзве акрываўленыя стралы. Абодва месцамі запырсканы крывёю. Усе ўстрывожана глядзяць на ўвайшоўшых, чакаючы дрэнных вестак.*

**Воін са стрэламі** (*Аляксандру*):
Слухай, Аляксандр: татары
цераз Нёман перайшлі,
за Дакудава ўзяліся,
Збляны пачалі паліць.

**Канцлер** (*біскупу*):
За насельніцтва маліся,
за лугі і за палі.

*Біскуп пачынае шаптаць малітву.*

**Воін з кайстрай:**
Мы рабаўніка пабілі -
вось злачынца галава.
(*Дастае з кайстры за валасы акрываўленую галаву татарына*).

*Алена ціха ўскрыквае і адсоўваецца далей. Біскуп жагнаецца. Воін засоўвае галаву татарына назад у кайстру.*

**Канцлер** (*Аляксандру, занепакоена):*
Мабыць, прыйдзецца да Вільні
нам вяртацца, Аляксандр.

**Аляксандр:**
Трэба ў Вільню нам вяртацца:
вельмі блізка рабаўнік.

**Воін з кайстрай** *(спакойна)*:
У крыві ляжаць татары
на дакудаўскіх лугах.
*(Паляпвае па кайстры.)*

*Воіны нясуць Аляксандра са сцэны і хаваюцца самі.*

**Заслона.**

## *Дзея чацвёртая*

*Сцэна другой дзеі. На заднім плане - павялічаныя ў колькасці шарэнгі апалчэнцаў. Усе чакаюць выхаду з Ліды. На пярэднім плане - два апалчэнцы.*

**2-і апалчэнец** *(1-му)*:
Кажуць, целамі пабітых
поўны лугавы кілім.

**1-ы апалчэнец** *(пасля некаторай паўзы)*:
Караля павезлі з Ліды.
Біскуп і княгіня з ім.
Канцлер і пачот ваенны
едуць побач з каралём.

**2-і апалчэнец:**
Кажа правільна Алена:
ён бы войска не павёў.

**1-ы апалчэнец** *(працягвае)*:
У калысцы ён, знямоглы.
Паміж сёдламі яна.
І гавораць, твар ягоны
вельмі бледны, як сцяна.
Толькі бы кароль даехаў,
толькі б на зямлю не ўпаў.

**2-і апалчэнец:**
Кажа правільна Алена:
шчокі - быццам ён не спаў.

*слабейшы, сядзіць на ложку. Яго падтрымлівае Алена. Побач сядзіць медык. На стале ля ложка - збан з ярка-чырвонай ружай. Уваходзіць кухар.*

**Алена** *(кухару)*:
З ложка мужа падняла я.

**Кухар** *(Аляксандру)*:
Што на снеданне варыць?

**Алена** *(кухару)*:
Мова ў мужа аднялася -
ён не можа гаварыць.
Тое зварыце, што любіць,
аб чым медык гаварыў.

*Кухар з разуменнем ківае галавой і хаваецца са сцэны. За акном чуецца шум натоўпу. Медык устае і падыходзіць да акна, углядаецца.*

**Алена** *(не адыходзячы ад Аляксандра, які без яе не зможа сядзець):*
Чуеце трывогу вуліц?
Бачыце ганца ў двары?

**Медык** *(пасля некаторай паўзы)*:
Гэта не трывога - радасць.
Радасны імчаў ганец.

*За дзвярыма - шпаркі тупат ног па сходнях. Стук у дзверы. У пакой улятае запыханы і радасны ганец у светлай вопратцы.*

**Ганец** *(цяжка дыхаючы, але з радасцю):*
Гэтаю парой гарачай
ворагу прыйшоў канец!

*(Перавёўшы дух.)*
Лагер знішчаны на Лані.
Тысяч каля дваццаці.
Леглі збітымі валамі.

*Радасны Аляксандр дае зразумець, што не хоча класціся, і адмоўна ківае галавой на снеданне.*

**Алена** *(кухару)*:
Есці Аляксандр не будзе.

*Кухар забірае снеданне і хаваецца са сцэны.*

**Алена** *(медыку)*:
Прыме лекі Аляксандр.

*(Дае Аляксандру лекі, кароль прымае іх.)*

**Медык** *(Алене)*:
Хай ніхто яго не будзіць.
Палажы яго.

*Алена збіраецца дапамагчы Аляксандру легчы.*

**Аляксандр** *(раптам гаворыць слабым голасам)*:
Я сам.
*(Кладзецца, з твару не знікае радасць.)*
Перамога…

*Аляксандр цягнецца слабай рукой да стала.*

**Медык** *(зразумеўшы, што патрэбна Аляксандру)*:
Кветку дайце!

*Алена дастае са збана кветку і асцярожна ўкладвае яе ў руку мужа. Аляксандр прытуляе кветку да сваіх грудзей.*

**Аляксандр:**
Перамога… Кветка… Кроў…
*(Раптам голас караля мацнее, ён звярта-*

## Кароткая біяграфічная даведка

Алесь (Аляксандр Іосіфавіч) Мацулевіч нарадзіўся 19 студзеня 1981 года ў Лідзе. Пасля школы вучыўся ў Лідскім педагагічным вучылішчы (зараз - Лідскі каледж), на аддзяленні "Пачатковыя класы". У 2000-2005 гг. вучыўся ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна, на філалагічным факультэце (руская мова і літаратура). Працуе ў рэдакцыі "Лідскай газеты".

Вершы Алеся Мацулевіча перыядычна друкуюцца на старонках "Лідскай газеты", публікаваліся яны і ў літаратурна-мастацкім часопісе "Верасень". На адзін з іх кампазітарам Аляксандрам Якіменка (г. Астравец) напісана песня "Роднаму гораду". Яна і пачынае зборнік "Леў і ключы" - першую паэтычную кнігу Алеся Мацулевіча.

Дыханне вясны 33
Свята працы 34
Гарадок дзіцячых мар 35
Той, хто прыносіць навіны 36
Вочы і вушы СПА 36
Тыдзень лесу 37
Тыдзень лесу (Дапаможам лясгасам!) 38
На ваўка 39
Нястомны Вайгач 40
Бабровыя слёзы 41
Пашкадуйце лебедзяў! 42
Птушкі з казкі 42

**Эцюды аб Лідскім возеры**

Пралог 44

***Летнія эцюды***

Плённых канікул! 44
Катэр-вецер 45
Каму не раяць быць на пляжы 46
Вадалаз 47
Прагулка на выратавальным катэры 47
Людзі ў цяльняшках 48

***Зімовыя эцюды***

Новы год у палонцы 49
Свята "Белага мядзведзя" 50
Вадохрышчанская купель 51
Зімовая рыбалка 51
Спаборніцтвы па падлёднай лоўлі 52
Рыбачка з Набярэжнай 53

**Паэмы**

Ліда 54
Вайдыла 61
Тахтамыш 68

**П'еса**

Чырвоная ружа 75

Кароткая біяграфічная даведка 89